Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# Добрушскі край

17 ліпеня 2019 года
Серада

№53 (10871)

ЗАНЯТАСЦЬ



Першакурснікі Антон Зязюлін, Мікіта Лабанаў і Кацярына Пабіяха працуюць над чарговым стэндам

# І сабе, і ліцэю

## У Добрушскім ліцэі завяршаецца праект па арганізацыі другаснай занятасці падлеткаў

Першакурсніца Добрушскага політэхнічнага ліцэя Кацярына Пабіяха неўзабаве адпачне ў аздараўленчым лагеры ў Налібокскай пушчы. А таму прапанову папрацаваць у майстэрні па вырабе інфармацыйных стэндаў успрыняла, як кажуць, “на ўра”. Работа – платная, будзе з чым ехаць на адпачынак.

– Не ўпершыню ўдзельнічаю ў такіх праектах, – расказвае яна. – Летась працавала ў студэнцкім атрадзе пры “Добрушскім камунальніку”, зарабіла свае першыя грошы – 60 рублёў. Сёлетні заробак можа і меншы, аднак працую ж на карысць свайго ліцэя.

У праекце па другаснай занятасці бярэ ўдзел яшчэ восем хлопцаў-першакурснікаў і адна дзяўчына. Мужчынская палова брыгады працуе з пластыкам, з якога клеяць стэнды. А вось аздабленне і размяшчэнне інфармацыі – “дзявочая” епархія. За дзесяць дзён праекта з майстэрні выйшла 10 стэндаў, яны будуць размешчаны ў калідорах навучальнай установы.

– Праект фінансуецца фондам сацыяльнай абароны насельніцтва, – расказвае намеснік дырэктара ліцэя Таццяна Мітрафанава. – Агульны кошт – больш за тысячу рублёў. 800 з іх – заробак навучэнцаў. Пасля выплаты падаткаў кожны атрымае паўсотні рублёў. Аднак галоўнае не гэта. Летняя занятасць дазваляе навучэнцам набыць першыя працоўныя навыкі і з’яўляецца дзейснай мерай прафілактыкі злачынстваў і правапарушэнняў.

Па словах суразмоўцы, большасці ліцэістаў гэтым летам адпачываць некалі. Брыгада па добраўпарадкаванні і азеляненні з 12 навучэнцаў працуе на тэрыторыі ліцэя, аналагічная брыгада, але ўжо рамонтная, наводзіць парадак у інтэрнаце. Па традыцыі ліцэісты ўваходзяць і ў склад экалагічнага студэнцкага атраду, створанага райкамам БРСМ пры “Добрушскім камунальніку”. Больш за 30 юнакоў і дзяўчат працаўладкаваліся на летні перыяд на прадпрыемствы па месцы жыхарства.

**Сяргей МІХАЙЛАЎ**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

## Весткі з месцаў

### З найменнем “народны”

**Арт-групе “Бульбаш” раённага Палаца культуры прысвоена ганаровае званне “народны”. Адпаведную пастанову Міністэрства культуры Беларусі прыняло 8 ліпеня.**

Як паведамілі ў раённым Палацы культуры, канцэрт-справаздачу добрушскія спевакі прадэманстравалі атэстацыйнай камісіі яшчэ ў красавіку. Аднак не толькі іх жывое выступленне паўплывала на прыняцце рашэння. У актыве гурта – удзел і перамогі ў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах і фестывалях.

**Сяргей ЧАЙДАК**

### Падарунак мастака

**У мінулую пятніцу Добрушчыну наведаў дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў.**

Наш зямляк прыехаў, каб павіншаваць з днём нараджэння маці, якая жыве ў Жгунскай Будзе. Не мог ён не наведаць і калег з Добрушскага раённага краязнаўчага музея. У падарунак сталічны госць прывёз карціну вядомай беларускай мастачкі Алены Сеслікавай з яе даравальным подпісам.

**Сяргей ВОЛЬГІН**

### Сустрэча з гонарам

**Сярэбраны прызёр II Еўрапейскіх гульняў Уладзіслаў Смяглікаў наведаў фізкультурна-спартыўны цэнтр дзяцей і моладзі, у якім працаваў трэнерам.**

Вядомы спартсмен сустрэўся з выхаванцамі ФСЦДіМ, якія адпачывалі ў аздараўленчым лагеры «Юнацтва».

Па словах сярэбранага прызёра прэстыжных спаборніцтваў, асаблівыя сілы ў баях надавала прысутнасць на трыбунах групы падтрымкі з нашага раёна. Госць пажадаў педагогам школы поспехаў працы, а падлеткам – праславіць родны горад спартыўнымі дасягненнямі.

**Леанід ДУБОЎСКІ**

ISSN 2073-1000

**ПОГОДА**

Долгота дня 16.32
Луна
18, 19 июля — в Водолее,
20 — в Рыбах



Полнолуние 17 июля

**18 июля**
НОЧЬЮ +14…+15
ДНЕМ +18…+19
Переменная облачность.
Небольшой дождь.
Ветер западный 2-5 м/с.

**19 июля**
НОЧЬЮ +15…+16
ДНЕМ +21…+23
Переменная облачность.
Небольшой дождь.
Ветер западный 1-3 м/с.

ПРЯМАЯ ЛИНИЯ

# Не затягивая узел

**В прошедшую пятницу прошла прямая телефонная линия с участием заместителя председателя Комитета государственного контроля Гомельской области Елены Ковалёнок.**

На прямую линию позвонил житель агрогородка Васильевка. Суть обращения: наведение порядка на придомовой территории соседа заявителя. Его обращение взято на контроль в Добрушском райисполкоме.

– Соседу обратившегося за помощью выписано предписание. Как заверили работники райисполкома, недостатки в обслуживании территории будут устранены. Мы, в свою очередь, также проконтролируем их выполнение. Других обращений граждан не поступало. По анализу, Добрушский райисполком работает лучше других с обращениями граждан в области, – отметила в беседе с корреспондентом «ДК» Елена Ковалёнок.

Местная власть оперативно разрешает возникающие проблемы на местах.

**Леонид МИНИЧ**
**Фото Евгения УСТИНОВА**



КОММУНАЛЬНАЯ СЛУЖБА

# Труба трубе – рознь

**Тепловики «Добрушского коммунальника» завершают работы по замене устаревших тепловых труб в центральной части города. Сегодня они ведутся в сквере на проспекте Мира.**

– Используем предварительно изолированные ПИ-трубы, которые служат гораздо дольше обычных, долгие годы снабжавших теплом многоэтажные дома, – рассказывает мастер Вадим Цирулик. – Расчетный срок эксплуатации ПИ-труб – более 20 лет. С вводом в эксплуатацию новой теплотрассы значительно снизятся потери тепла от котельной до потребителя.

По словам мастера, новые теплотрассы уложены в прошлом году на улице Богдана Хмельницкого, к домам на улице Паскевича и около Дома быта. С порученным делом успешно справляются опытные работники Вячеслав Гончаров, Виталий Гринько, Николай Бруенков, сварщик Валерий Потылкин.



Сварщик Валерий Потылкин

Для безопасного движения автотехники по проспекту Мира прокладка сети в направлении теплового колодца проведена в максимально короткое время с последующей укладкой асфальтобетона.

Раскопанный газон в сквере – мера вынужденная. За тепловиками сюда придут рабочие зеленого строительства и придадут этой территории прежний ухоженный вид.

**Леонид ДУБОВСКИЙ**
**Фото Евгения УСТИНОВА**

НАЗІРАЛЬНЫЯ КАМІСІІ

# Фармалізм недапушчальны

**Прынцыповай, калі не сказаць, жорсткай атрымалася гутарка на абласной селектарнай нарадзе па прафілактыцы пажараў і папярэджанні гібелі людзей ад знешніх прычын. Дыялог будавалі на аналізе недахопаў у рабоце назіральных камісій.**

...5 год жыхары шматпавярховага дома ў Гомелі непакояць два браты, 1982 і 1988 гадоў нараджэння, якія злоўжываюць спіртнымі напоямі. Абодва не працуюць, не плацяць за камунальныя паслугі, 44 разы прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці. Кватэра, у якой яны пражываюць, – сапраўдны прытон. І пры гэтым браты не накіроўваліся ў лячэбна-працоўны прафілакторый, не разглядаліся на камісіі ў грамадскім пункце аховы правапарадку.

– Назіральныя камісіі іх "наведвалі" двойчы, – адзначыў начальнік аддзела нагляду і прафілактыкі абласнога ўпраўлення МНС Дзмітрый Галкін. – Згодна са складзенымі актамі, у кватэры – антысанітарныя ўмовы. Тым не менш, гаспадары не прыцягваліся да адказнасці за парушэнне правіл карыстання жылымі памяшканнямі.

Дзмітрый Галкін адзначыў: у вобласці назіраецца складаная аператыўная абстаноўка. У 18 раёнах у першым паўгоддзі 2019 года ўзрасла колькасць пажараў. У Добрушскім – на 60 працэнтаў. Выклікае трывогу і вялікі рост колькасці загінуўшых на пажарах. На Добрушчыне ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ён узрос удвая: з 2 да 4. Найбольш крытычная сітуацыя, па ацэнках спецыялістаў, у Гомельскім раёне. Тут зафіксаваны рост ахвяр пажараў у чатыры разы.

Хібы ў рабоце служб спецыялісты абласнога ўпраўлення МНС вывучаюць і на месцах. На Добрушчыне яны наведалі Усоха-Будскі сельсавет.

– Пры наведванні грамадзян, якія злоўжываюць спіртным, высветлілася: медработнікі не праводзяць з імі гутарак аб шкодным уплыве алкаголю. Не ставіцца пытанне аб пастаноўцы іх на прафілактычны ўлік. Аб чым сведчыць адсутнасць запісаў у пратаколах. Такія ж парушэнні выяўлены ў іншых раёнах, – паведаміў Дзмітрый Галкін.

Маніторынг дзейнасці назіральных камісій, па словах прадстаўніка ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, будзе прадоўжаны.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**

НА СВЯЗИ

**20 июля с 9.00 до 12.00 по телефону 3-00-00**
прямую телефонную линию с жителями района проведет Геннадий Викторович МАЛЬЦЕВ, заместитель председателя райисполкома.

* * *

**18 июля с 10.00 до 12.00 по телефону 5-99-13**
пройдет прямая телефонная линия с участием Александра Владимировича АГЕЕВА, заместителя председателя комиссии по делам несовершеннолетних райисполкома.

ПРИЕМ

**20 июля с 8.00 д 13.00**
в кабинете № 5 райисполкома прием граждан и представителей юридических лиц проведет Геннадий Викторович МАЛЬЦЕВ, заместитель председателя райисполкома.

* * *

**20 июля с 8.00 до 14.00**
в приемной председателя райисполкома прием граждан и представителей юридических лиц проведет Ирина Михайловна ШКАРУБО, начальник отдела образования, спорта и туризма райисполкома.

В ЦЕНТРЕ ВНИМАНИЯ

## В Санкт-Петербурге проходит VI Форум регионов Беларуси и России

**Мероприятия VI Форума регионов Беларуси и России начались сегодня в Санкт-Петербурге. Накануне прибыла официальная делегация Совета Республики Национального собрания Беларуси, в составе которой около 250 человек.**

Основные мероприятия форума регионов начинаются 17 июля. На секциях будут рассматриваться вопросы формирования общего образовательного, информационного пространства, культурно-гуманитарные проекты, сотрудничество регионов и другие вопросы. На экспертной сессии обсудят стратегическое развитие Союзного государства. Планируется, что кульминацией форума станет участие президентов Беларуси и России в пленарном заседании 18 июля. Оно будет посвящено межрегиональным связям как основе формирования единого культурного и гуманитарного пространства двух государств.

Александр Лукашенко вместе с Президентом России Владимиром Путиным 18 июля примет участие в пленарном заседании VI Форума регионов Беларуси и России. В программе также расширенное заседание национальных деловых советов, в котором примут участие представители бизнеса двух стран. На форуме, который продлится по 18 июля, будут подписаны соглашения о сотрудничестве между регионами двух стран, коммерческие контракты, другие документы о сотрудничестве.

**По материалам БелТА**